# ЧЫСТАЯ ВАДА З КРАНА

## У жыхароў Маладзечна яна такая штодзень




Будынак водаканала прыцягвае ўсіх яркімі фарбамі і прыгожым панадворкам.



**«Я без асцярогі п'ю ваду з любога крана ў Маладзечанскім раёне, бо дакладна ведаю, што яна чыстая», — прызнаецца дырэктар гарадскога камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Маладзечнаводаканал» Андрэй ПАЎКШТА. Па словах дырэктара, абсалютная большасць насельніцтва раёна забяспечана якаснай вадой, якую можна, не баючыся, піць адразу з крана. А тыя, хто прапаноўвае набыць дарагія фільтры для ачысткі вады, імкнуцца на даверлівасці людзей зарабіць грошы.**

— «Маладзечнаводаканал» — гэта арганізацыя, якая абслугоўвае ўвадазабеспячэнні ўвесь Маладзечанскі раён, у якім 90% насельніцтва мае якасную ваду, адпаведную ўсім нарматыўным патрабаванням, — расказвае дырэктар прадпрыемства. — У раёне толькі меней за 10% вады з утрыманнем жалеза, вышэйшым за норму. Водазабеспячэнне ў Маладзечне адбываецца з двух водазабораў: «Крыніца» і «Гелінова». Глыбіні свідравін — ад 35 да 300 метраў. На ўсіх водазаборах маюцца станцыі абезжалезвання. Штодзённае выкарыстанне пітной вады насельніцтвам Маладзечне складае ад 20 да 22 тысяч кубічных метраў у суткі; калі ўлічваць увесь раён, то гэта яшчэ 2 тысячы.

Акрамя таго, сёння пад наглядам «Маладзечнаводаканала» больш за 516 кіламетраў сетак водапровада і больш за 317 кіламетраў сетак каналізацый, 27 ачышчальных збудаванняў, 160 артэзіянскіх свідравін, 46 каналізацыйна-помпавых станцый. У прадпрыемства маюцца сертыфікаты экалагічнай адпаведнасці якасці вады і сістэмы кіравання аховай навакольнага асяроддзя.

На прадпрыемстве працуе 460 чалавек, з іх 120 — моладзь. Пра сваіх супрацоўнікаў тут дбаюць: паляпшаюць умовы працы, аказваюць сацыяльную падтрымку. Калектыў прымае ўдзел ва ўсіх галіновых спартакіядах і традыцыйна перамагае ў скачках у даўжыню і футболе. На прадпрыемстве няма цякучасці кадраў. За апошнія гады заяву на звальненне падалі адзінкі.

Па словах дырэктара «Маладзечнаводаканала», апошнім часам жыхарам раёна часта сталі прапаноўваць усталяваць дарагія фільтры для ачысткі вады. Прадаўцы пераконваюць пакупнікоў хімічнымі доследамі, якія насамрэч дэманструюць не забруджвальнасць вады, а наяўнасць у ёй мікраэлементаў, не толькі не шкодных, а нават карысных для здароўя.

Паводле слоў Андрэя Паўкшта, галоўная прычына, па якой можна назваць ваду няякаснай, — гэта высокі працэнт наяўнасці жалеза. Для таго, каб яго зрабіць ніжэйшым, усталёўваюцца станцыі абезжалезвання. У двух аграгарадках такія станцыі ўжо пабудаваны. «Мы плануем працягваць гэтую працу, — кажа дырэктар. — У нас ужо падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя на яшчэ 2 аграгарадкі і ўсталяванне 3 станцый у іх. Дзякуючы ўдзелу ў дзяржаўнай праграме «Чыстая вада», у апошнія гады такім чынам аграгарадкі Хохлава, Хожава, Селіўцы, Гранічы сталі на 100% забяспечаны чыстай вадой».

Па словах Сяргея ФРЭНКЕЛЯ, начальніка лабараторыі «Маладзечнаводаканала», перад тым, як трапіць да спажыўца, вада праходзіць доўгі шлях ад артэзіянскай свідравіны і да крана ў доме. «Не сакрэт, што ў Беларусі вада ў свідравінах, як правіла, мае завялікую колькасць жалеза. Гэта наша геаграфічная асаблівасць. Таму ў горадзе Маладзечна зманціраваны



Лабарант Лілія КАРНАЦКАЯ кожны дзень сочыць за чысцінёй вады.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

і працуюць дзве станцыі па ачыстцы вады. Зыходная колькасць жалеза ў нашых свідравінах — каля 1 мг/л, а спажыўцу падаецца вада практычна без яго (па факце — у сярэднім 0,3 мг/л)», — кажа спецыяліст.

Напрыклад, тое, што падчас кіпячэння ў вадзе ўтвараецца асадак, сведчыць не пра яе нізкую якасць, а пра тое, што ў ёй досыць высокая агульная жорсткасць вады. Гэта не шкоднасць, а прыродная характарыстыка беларускай пітной вады. Бо яна, у адрозненне ад бутыляванай, якая праходзіць поўную хімічную ачыстку і штучную мінералізацыю, мае натуральны прыродны састаў.

— Сёння ёсць такія «ратавальнікі чалавецтва», якія сцвярджаюць, што з крана ідзе шкодная для здароўя вада: для зубоў, страўніка, нырак, — тлумачыць начальнік лабараторыі. — І без сістэм дадатковай ачысткі чалавека чакае хуткая і пакутлівая смерць. Не верце! Для Маладзечна такія дадзеныя — звычайная мана і выцягванне грошай з людзей. Задача такіх прадаўцоў — за высокі кошт прадаць ачышчальную сістэму, атрымаць прыбытак і забыцца на спажыўца. Прыйсці ў маладзечанскую кватэру для праверкі якасці вады могуць толькі дзве арганізацыі: «Маладзечнаводаканал» і Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Хімічныя доследы — электроліз, TDS-метры, якія праводзяць прадаўцы сістэм, — не правераны ні ў адным органе Дзяржстандарта. Гэта не больш, чым фокусы, і якасць вады ніяк на іх не адбіваецца.

Таксама ў «Маладзечнаводаканале», як і ва ўсіх водаканалах краіны, распрацавана рабочая праграма кантролю якасці вады. Ён адбываецца на ўсіх стадыях: ад здабычы вады са свідравін да апошняга крана. У залежнасці ад паказчыкаў, якіх для КУП існуе каля 20, некаторыя аналізы робяцца раз на год, асобныя — тры разы на тыдзень, але ўсе яны дакладна распісаны ў праграме, якая падпісваецца ў органах мясцовага самакіравання, узгадняецца з Цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі. На мікрабіялагічны аналіз вада бярэцца тры разы на тыдзень з рэзервуара, каб выключыць магчымасць мікробнага забруджвання паводкавымі водамі, асадкамі. Па хімічным саставе вада кантралюецца раз на год па кожным паказчыку. Па абагульненых паказчыках — жорсткасць, вадародны паказчык Ph, нафтапрадукты — кантроль адбываецца раз на квартал. Амаль усе даследаванні праводзяцца на базе лабараторыі водаканала.

«Вада ў Маладзечне не толькі бяспечная, але і прыемная на смак. Яна не патрабуе дадатковага кіпячэння, абеззаражвання, — упэўнены Сяргей Фрэнкель. — Звычайна нашы жыхары без боязі п'юць ваду адразу з-пад крана».

УНП 600000011

# ПРАСТОРА ДЛЯ ТВОРЧАГА РОСТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Мы не рыхтуем да школы, але займаемся творчасцю разам з падапечнымі. Так дзеці лепей сацыялізуюцца: спакойныя — разнявольваюцца, вучацца праяўляць сябе, занадта актыўныя — становяцца кіруемымі і больш паслухмянымі», — дзеліцца вопытам кіраўнік цэнтра.

У «Растку» для дашкольнікаў працуюць студыі рытмікі і харэаграфіі, музыкі і песні, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, развіваючых гульняў, англійскай мовы, а таксама тэатральная студыя. Але традыцыйным «студыйным» падыходам да працы «расткоўцы» не абмяжоўваюцца. У цэнтры часта ладзяцца святы для ўсёй сям'і і майстар-класы, на якіх бацькі могуць прыйсці разам з дзеткамі. «Часцей за ўсё прыходзяць на такія заняткі маці ў дэкрэтным адпачынку, ці тыя, у каго дзеці — дашкольнікі. Яны садзяцца побач за стол, маці робіць свой выраб, дзіця — свой. Мы дапамагаем ім абодвум, і маці, вядома ж, глядзіць, што робіць дзіця. У нас ёсць такога кшталту і разавыя майстар-класы, і пастаянныя групы», — расказвае Вольга ЯФІМЧАНКА, кіраўнік студыі дызайну «Утульнасць» дзіцячага цэнтра культуры.

Акрамя таго, што Наталля Соніч кіруе дзіцячым цэнтрам, яна таксама вядзе студыю эстрадных спеваў «Брава». Яе ўдзельнікі, якіх цяпер 14, паспяваюць не толькі вучыцца ў школе, але і наведваць студыю, а ў выхадныя — выступаць на творчых і вакальных конкурсах, у якіх амаль заўжды займаюць прызавыя месцы. За першыя пяць месяцаў 2016 года на рахунку калектыву — 72 перамогі, з якіх больш за 30 атрымана ў маі. Асаблівая «Брава» ганарыцца Маркам Войткам, які амаль усё дзяцінства праспяваў у студыі, пасля паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, а цяпер — саліст групы «PROвокация». «Прыемна, што Марк не забываецца на родны калектыў. Часам нават спецыяльна прыязджае на нашы выступленні, каб падтрымаць хлопцаў і дзяўчат, бо ведае, як для іх гэта важна», — з лагоднай усмешкай падсумоўвае Наталля Соніч.



# МАЛАДЗЕЧАНСКІЯ ЛЫЖАЧНІКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— З цягам часу і дзякуючы пастаянным трэніроўкам гэта выпраўляецца і становіцца адбіваецца на далейшым развіцці вучняў. Многія з нашых выхаванцаў маюць поспехі не толькі ў мастацтвах, але і перамагаюць на гарадскіх, раённых, рэспубліканскіх алімпіядах па матэматыцы (часцей за ўсё гэта музыкі), прыродазнаўчых і філалагічных навуках.

Аляксандр РОЗІН, кіраўнік ансамбля «Маладзечанскія лыжачнікі», прыгадвае, што калі набіраў першых удзельнікаў, да яго трапілі выключна хлопцы. «Так і пайшло, што калектыў у нас — мужчынскі. Толькі нядаўна да нас далучылася дзяўчына, якая прыўносіць парадак, але з іншага боку — атрымлівае ад нашых хлапцоў паслухмяныя паводзіны і павażлівае стаўленне», — дзеліцца кіраўнік.

Пачыналі з нуля. Шукалі майстроў, якія б маглі вырабіць лыжкі для ігры нядорага і якасна. Раней выкарыстоўвалі распісаныя пад хахламу, а цяпер — непафарбаваныя. Бо лыжка жыве сезон-два, а пасля, як правіла, ламаецца. Па словах Аляксандра Рагозіна, і нот для лыжачнікаў ніхто не піша, і прыёмы не распрацоўвае. Таму даводзіцца праяўляць у пастаноўцы нумароў усю крэатыўнасць, на якую здольныя, і кіраўніку, і самім школьнікам. Цяпер ансамбль традыцыйна выступае пад фанаграму і, як склалася, у народных кашулях.

З цягам часу ў лыжачнікаў паляпшаецца не толькі пачуццё рытму, але і развіваецца артыстызм, знікае боязь сцэны, заўважае іх настаўнік. «Самае галоўнае — мы можам выступаць дзе заўгодна! Узялі касцюмы, лыжкі, заплечнікі — і паехалі. Мы мабільныя!», — кажа кіраўнік ансамбля. — Прыемна, што дзеці стараюцца прыйсці на заняткі, амаль ніхто не прапускае ўрокаў. Значыць, ім цікава, і мы нездарма калісьці вырашылі сабраць калектыў.

## ■ Справа медыцынская

# Чым маладзейшы, тым даражэйшы



**Кацярына Зяневіч — малады спецыяліст, доктар агульнай практыкі. У свае 26 яна ўжо працуе загадчыцай Ахляховіцкай амбулаторыі Маладзечанскай цэнтральнай раённай бальніцы. Кацярына два гады таму скончыла Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт па спецыяльнасці «Доктар-лячэбнік». Год інтэрнатуры правяла ў Маладзечанскай бальніцы, прайшла перападрыхтоўчыя курсы, стала доктарам агульнай практыкі, і амаль адразу ж атрымала адказную пасаду, на якой працуе ўжо паўгода.**

— Я ішла ў прафесію мэтанакіравана. Сярод сваякоў шмат дактароў. Усё маё дзяцінства прайшло не ў садзіку, а ў маці на ФАПе і ў амбулаторыі. У тэрапію пайшла таму, што падабаецца больш працаваць з дарослымі. Праўда, цяпер даводзіцца лячыць і дзяцей. Гэта цяжкавата, але мне заўжды дапамагаюць парадамі дактары з Маладзечанскай бальніцы і сям'я, — расказвае Кацярына.

Па словах маладога доктара, большасць яе аднагрупнікаў засталася працаваць у Мінску. Чаму сама размеркавалася ў раён? «Пэўную ролю адыграў прыклад маці. Ды і пражыла я тут усё жыццё. Таму працаваць у амбулаторыі больш даспадобы, чым у горадзе», — адказвае яна.

Цяпер у працоўны дзень на прыём да Кацярыны прыходзіць ад 30 да 60 чалавек (усяго насельніцтва ў зоне абслугоўвання 2750 чалавек).

«З калектывам я ў добрых адносінах. Калегі мне вельмі дапамагаюць. Напрыклад, медсёстры могуць і ціск памераць, і градуснік даць, калі я на выездзе, каб чалавек не сядзеў у чарзе без увагі, і кардыяграму здымуць. І ў іх можна быць упэўненым», — кажа Кацярына Зяневіч. У амбулаторыі ёсць і лабараторыя, дзе робіцца асноўная частка аналізаў. Працуе дзённы стацыянар, фізія- і акушэрскі кабінет. «Для поўнай аснасткі не хапае толькі рэнтгена», — смяецца загадчыца.

Сёння доктар агульнай практыкі — своеасаблівы аналаг заходняга «сямейнага» ўрача, бо шчыльна кантактуе з аднымі і тымі ж людзьмі. Ён валодае агульнымі, больш шырокімі за тэрапеўта ведамі (можа лячыць і дзяцей), прызначае неабходныя абследаванні, праводзіць першаснае лячэнне перад тым, як накіраваць да вузкага спецыяліста.

Праўда, прызнаецца Кацярына, гэта адна з прычын, чаму пакідаць працу за парогам дома не атрымліваецца: «Асабліва хваляюся за дзетак да года, бо ў іх хваробы развіваюцца хутчэй, чым у дарослых. Перажываю часам так, што званю вечарам і пытаюся, ці спала тэмпература ў дзіцяці. І даю нумар мамам, у якіх маленькія, і пры неабходнасці кансультую па тэлефоне ўвечары».

Нягледзячы на ўсе непазбежныя для яе прафесіі цяжкасці, Кацярына захоўвае бадзёры дух і з захапленнем расказвае пра сваю справу: «Калі да мяне прыходзіць дзядуля, які скардзіцца на жыццё, а праз тыдзень на прыёме кажа: «Доктар, дзякуй, вы мне так дапамаглі!», — гэта прыдае столькі сіл! Радасць ад таго, што дапамог камусьці, натхняе развівацца, удасканальваць веды і працаваць надалей».

Матэрыялы падрыхтавалі Вераніка ПУСТАВІТ, Ірына СІДАРОК, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Надзеі БУЖАН і Сяргея НІКАНОВІЧА.